# ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК

А. Н. АКСЁНАЎ,
першы сакратар абкома КП Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР

СЁННЯ САВЕЦКІ НАРОД, нашы браты з сацыялістычных краін, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаюць самае вялікае, самае радаснае і светлае свята — 50-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

На паўвекавым рубяжы гістарычнага шляху радзімы Вялікага Кастрычніка перад усім светам з новай сілай паўстае веліч подзвігу, здзейсненага працоўнымі нашай краіны ў векапомным 1917 годзе.

Кастрычніцкая рэвалюцыя — самая народная і самая вялікая з усіх рэвалюцый, якія ведае гісторыя, — зрабіла найглыбейшы пераварот у лёсе мільёнаў людзей. Яна назаўсёды вызваліла працоўных нашай краіны ад капіталістычнага рабства і нацыянальнага прыгнёту. Яна прынесла ў кожны дом, у кожную сям'ю найглыбейшае шчасце, прынесла працоўным такія сацыяльныя даброты, як права на працу, адукацыю, адпачынак, ахову здароўя, забеспячэнне ў старасці, няўхільны рост дабрабыту.

Ад памешчыцка-капіталістычнага ладу — да карэнных сацыяльных пераўтварэнняў, да грамадства, якое не ведае эксплуатацыі. Ад палітычнага бяспраўя працоўных — да сацыялістычнай дэмакратыі. Ад нацыянальнага прыгнечання народаў — да іх свабоды і роўнасці, дружбы і братэрства. Ад тэхніка-эканамічнай адсталасці — да сучаснай індустрыі і механізаванай калектыўнай сельскай гаспадаркі. Ад непісьменнасці — да небывалага росту народнай адукацыі, навукі і культуры. Вось гістарычны, сапраўды гіганцкі шлях, пройдзены нашай Радзімай на працягу жыцця толькі аднаго пакалення.

●

...зямлі,ператвараў Наддзвінне ў індустрыяльны край рэспублікі. Ніколі не будуць забыты імёны ініцыятараў калгаснага руху на Віцебшчыне — актыўных змагароў за перабудову сельскай гаспадаркі на новую, сацыялістычную аснову.

З ГОРДАСЦЮ гаворым мы сёння аб тым, як у суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны зноў ва ўвесь рост стаў чалавек сацыялістычнага свету — савецкі патрыёт, як з усёй паўнатой раскрыўся яго характар стойкага, бясстрашнага рэвалюцыянера і барацьбіта, выхаванага Камуністычнай партыяй. І думаем пра 120 тысяч нашых землякоў — воінаў Савецкай Арміі і Флоту, якія не ведалі страху ў баі, самаадданна абаранялі сваю сацыялістычную Радзіму. Пра 35 віцебскіх партызанскіх брыгад, якія не давалі ні днём, ні ноччу ворагу спакою на часова акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі вобласці. Не толькі сучаснікі, але і нашчадкі нашы будуць ганарыцца неўміручымі подзвігамі нашых землякоў — легендарнага генерала Льва Даватара, бясстрашнага сокала Аляксандра Гараўца, адважнай медсястры Зінаіды Тусналобавай-Марчанка і многіх, многіх іншых герояў Вялікай Айчыннай вайны. Заўжды будзем помніць баявыя справы праслаўленых віцебскіх партызанскіх брыгад і злучэнняў пад камандаваннем Герояў Савецкага Саюза М. П. Шмырова, К. С. Заслонава, П. М. Машэрава, У. Е. Лабанка, А. Ф. Данукалава, І. К.

Сялянства дарэвалюцыйнай Віцебшчыны знаходзілася пад невыносным палітычным і эканамічным прыгнётам. 82,4 працэнта ўсёй зямлі Віцебскай губерні належала памешчыкам. Селянін жа ў лепшым выпадку меў паўдзесяціны на двор. А тысячы сялянскіх сем'яў былі наогул беззямельнымі. Становішча іх заставалася жудасным. Голад, галеча панавалі паўсюдна. Гэта вымушаны былі прызнаваць нават прадстаўнікі мясцовай улады.

«Сяляне амаль не ведаюць хлеба, харчуюцца грыбамі і рознымі сырымі рэчывамі, якія параджаюць хваробы, — даносіў начальству аб жыцці сялян Віцебскай губерні ў 1855 годзе сам губернатар. — Галеча страшэнная...»

Насельніцтва Віцебскай губерні не мела і палавіны той колькасці хлеба, якая неабходна была толькі для падтрымання жыцця.

За 50 савецкіх гадоў у жыцці нашай вёскі адбыліся вялікія рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Здзейснілася спрадвечная мара селяніна аб зямлі, аб вольнай працы, аб заможным і шчаслівым жыцці.

Ад ленінскага Дэкрэта аб зямлі да суцэльнай калектывізацыі і карэннага пераўтварэння ўсяго ўкладу жыцця сялян — такі шлях развіцця нашай сельскай гаспадаркі за мінулыя паўвека.

Першыя калектыўныя гаспадаркі пачалі стварацца неўзабаве пасля перамогі Кастрычніка. У трыццатыя гады на Віцебшчыне была завершана суцэльная калектывізацыя сяла. З першага дня Савецкай улады Камуністычная партыя і ўрад штодзённа клапаціліся і клапоцяцца аб сельскіх працаўніках, аб развіцці прадукцыйных сіл вёскі. Сацыялістычная сельская гаспадарка пераведзена на рэйкі буйной высокаме-

З поўным тэкстам дакумента магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы